УДК 37.017.4-053.81:172.15]:316.32

## ПАТРЫЯТЫЗМ ВА ЎМОВАХ ГЛАБАЛІЗАЦЫІ

***В. М. Белакурскі,*** *кандыдат філасофскіх навук, дацэнт,*
*дацэнт кафедры сацыяльных дысцыплін установы адукацыі*
*«Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»*

***Ж. Я. Белакурская,*** *кандыдат філалагічных навук, дацэнт,*
*дацэнт кафедры міжкультурных камунікацый і рэкламы ўстановы*
*адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»*

**Анатацыя.** Працэс глабалізацыі ў сучаным яго варыянце па сваіх шматлікіх параметрах уваходзіць у супярэчлівасць з бяспечным развіццём. Адпаведна з усёй сур'ёзнасцю паўстае пытанне аб мадыфікацыі форм і метадаў глабалізацыі. Артыкул прысвечаны аналізу паняццяў «патрыятызм» і «патрыятычнае выхаванне» ў розныя перыяды развіцця грамадства. Мэтай артыкула з'яўляецца раскрыццё стану тэарэтычных аспектаў праблемы патрыятычнага выхавання як прыярытэтнага напрамку адукацыйнай палітыкі ва ўмовах глабалізацыі. Асаблівая ўвага надаецца сучасным сродкам патрыятычнага выхавання. Аўтары актуалізуюць палажэнне, што фарміраванне патрыятызму ў сучасных умовах павінна выйсці на якасна новы ўзровень навукова-практычнага асэнсавання.

**Ключавыя словы:** патрыятызм, глабалізацыя, патрыятычнае выхаванне, каштоўнасць, самаўдасканаленне.

## PATRIOTISM IN THE CONDITIONS OF GLOBALIZATION

***V. Belakurski,*** *PhD in Philosophy, Associate Professor, Associate Professor*
*of the Department of Social Disciplines of the Educational Establishment*
*«The Belarusian State University of Culture and Arts»*

***Z. Belakurskaya,*** *PhD in Philology, Associate Professor, Associate Professor*
*of the Department of Intercultural Communications and Advertising of the*
*Educational Establishment «The Belarusian State University of Culture and Arts»*

**Abstract.** The modern version of the process of globalization in its numerous parameters is in contradiction with safe development. Accordingly, the question of modifying the forms and methods of globalization arises with all seriousness. The article is devoted to the analysis of ideas of «patriotism» and «patriotic education» in different periods of society development. The purpose of the article is to reveal the state of theoretical aspects of the problem of patriotic education as a priority direction of educational policy in the context of globalization. The authors actualize the position that the formation of patriotism in modern conditions should reach a qualitatively new level of scientific and practical understanding.

**Keywords:** patriotism, patriotic education, values, self-improvement.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Працэсы глабалізацыі рэзка абвастрылі праблему захавання нацыянальнай ідэнтычнасці, паставіўшы пад сумненне каштоўнасць патрыятызму як яе асновы. З аднаго боку, глабалізацыя прадугледжвае далейшую актывізацыю міжкультурнага ўзаемадзеяння, вынікам якога павінна стаць пашырэнне сувязі з прадстаўнікамі іншых культур, распаўсюджванне прагрэсіўных культурных інавацый. З другога – у гэты працэс усё больш актыўна ўмешваюцца глабальныя «гульцы» – ЗША, Вялікабрытанія і іншыя краіны Захаду, уплывовыя міжнародныя арганізацыі, якія бачаць у кіраванні шматлікімі ідэнтыфікацыямі эфектыўны сродак узмацнення свайго ўплыву на сусвет. Адным з наступстваў глабалізацыі з'яўляецца стандартызацыя, вестэрнізацыя культуры, пагражаючая культурнай разнастайнасці нацый і народаў. Глабалізацыйныя працэсы маюць даволі вывераную накіраванасць – скарачэнне ролі нацыянальнай памяці, спрашчэнне гістарычнай канвы развіцця соцыумаў, умацаванне ўніфікацыйных тэндэнцый. Імкненне вядучых заходніх краін сфарміраваць касмапалітычныя ідэнтычнасці ў глабальным соцыуме заснавана на канцэпцыі «мяккай моцы», распрацаванай ідэолагамі ЗША. Асоба паўстае ў ёй як «чалавек без уласцівасцей» (Рорці). Усё гэта вядзе да пэўных вынікаў. «Узнікае фенамен масавай сацыякультурнай адчужанасці ад сваёй прафесіі, ад сваёй групы, прыналежнасць да якіх пачынае ўспрымацца як няўдача ці нават знак адхіленасці <…> Пакінутая зямля, пакінутыя прафесіі, пакінутая айчына – вось вынікі гэтага разрыву паміж фактычнай і рэферэнтнай прыналежнасцю» [4, с. 196–197]. Сёння заходнія «карэктыроўкі» нацыянальнай ідэнтычнасці рэалізуюцца праз замену адукацыйных стандартаў, актыўнае распаўсюджванне прадукцыі масавай культуры, рэкламу і інш. Усё гэта трансфармуе светапоглядныя ўстаноўкі, нормы і каштоўнасці, разбурае сімвалічны капітал нацыі. Супрацьстаяць гэтым тэндэнцыям можна, толькі ідучы шляхам адстойвання духоўных каштоўнасцей і культурных традыцый, іх актыўнай прапаганды ў свеце. Як трапна адзначае Д. Лоуэнталь, «…здольнасць успамінаць і ідэнтыфікаваць сябе са сваім мінулым надае існаванню сэнс, мэту і каштоўнасць» [1, с. 91]. Гісторыя грамадства яскрава сведчыць нам аб тым, што патрэба ў патрыятызме набывае асаблівую актуальнасць менавіта ў складаны для чалавека і краіны час.

Патрытызм як каштоўнасныя адносіны чалавека да сваёй Радзімы не страчвае свайго значэння ва ўмовах культурнай глабалізацыі, застаючыся сродкам інтэграцыі нацыянальнай супольнасці, асновай фарміравання неабходнага ўзроўню нацыянальнай ідэнтычнасці. Разам з тым ён садзейнічае эфектыўнаму супрацьстаянню працэсам вестэрнізацыі і касмапалітызацыі.

У першыя гады постсавецкага перыяду патрыятызм як асноўная катэгорыя «былой» дзяржаўнай ідэалогіі падвяргаўся даволі жорсткай крытыцы з боку ліберальных апанентаў улады, якія нават сцвярджалі аб яго недарэчнасці ў жыцці сучаснай краіны, а таксама выхаванні маладога пакалення.

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ

Такія змены ў палітычным жыцці грамадства вялі да ідэалагічнага вакууму. Апошні садзейнічаў узрастанню экстрэмізму ў краіне, у тым ліку сярод моладзі. Мінулагодняя палітычная сітуацыя ў Рэспубліцы Беларусь зноў паслужыла напамінам аб тым, што маладзёжны палітычны экстрэмізм можа стаць даволі сур’ёзным і небяспечным сродкам барацьбы ў інтарэсах дэструктыўных суб’ектаў палітычнай дзейнасці. Палітычная практыка сведчыць аб тым, што экстрэмізм як выражэнне крайніх поглядаў і ўстановак валодае здольнасцю пранікаць ва ўсе сферы грамадскага жыцця і ўяўляе сабой радыкальны спосаб вырашэння сацыяльных супярэчнасцей, узнікшых у тых ці іншых абласцях грамадскага жыцця.

Узнікаючыя сёння перашкоды фарміравання патрыятызму ў Рэспубліцы Беларусь абумоўлены ў значнай ступені тым, што ўключэнне краіны ў глабалізацыйныя працэсы адбываецца разам з сістэмнай сацыякультурнай трансфармацыяй грамадства. У пэўнай часткі насельніцтва сучаснай Беларусі дагэтуль адсутнічаюць выразныя ўяўленні аб «МЫ-супольніцтве», існуюць таксама памылковыя ўспрыманні вобраза Радзімы прадстаўнікамі розных пакаленняў соцыуму, а ў паўсядзённай свядомасці індывідаў звычайна паўстаюць пытанні іх этнічнай ідэнтыфікацыі.

У тэарэтычным плане патрыятызм трэба разглядаць як каштоўнасныя адносіны суб’екта да сваёй Радзімы, не толькі прыхільнасць да месца свайго нараджэння, пражывання, але прамое і зацікаўленае дачыненне да культурных каштоўнасцей грамадства, якія ўспрымаюцца як «свае», усведамленне асабістай адказнасці за сённяшні і будучы стан краіны. Найбольш выразна патрыятызм праяўляецца ў дзейнасці, накіраванай на карысць грамадства, заснаванай на ўсведамленні нацыянальных інтарэсаў. «Такім чынам, патрыятызм як каштоўнасць, якасць асобы праяўляецца на розных узроўнях па-рознаму: на інтэлектуальным (кагнітыўным) – як інтарэс да пазнання гісторыі Айчыны, як веданне айчыннай гісторыі; на эмацыянальным – як вышэйшае маральнае пачуццё; на інтэнцыянальным – як сацыяльна-маральны прынцып, як імкненне абараняць Радзіму; на дзейнасным (праксеалагічным) – у паводзінах і дзейнасці па забеспячэнні правапарадку і аховы асобы, грамадства і дзяржавы» [3, с. 85].

Сёння перад вышэйшай школай паўстала задача рэалізацыі цеснай узаемасувязі грамадзянскіх і патрыятычных каштоўнасцей у адукацыйна-выхаваўчым працэсе, паколькі яна павінна садзейнічаць фарміраванню не толькі кваліфікаванага, кампетэнтнага спецыяліста, але і сучаснага грамадзяніна-патрыёта [2]. Аналіз літаратурных крыніц сведчыць аб тым, што, нягледзячы на значную колькасць сучасных навуковых даследаванняў, тэма патрыятычнага выхавання студэнцкай моладзі патрабуе далейшага навуковага асэнсавання. Увага даследчыкаў пераважна сканцэнтравана на найбольш агульных характарыстыках патрыятызму, яго структурных узроўнях, канкрэтна-гістарычных умовах праяўлення. Разам з тым недастаткова праводзіцца аналіз яго месца і ролі ў сучасных умовах. Недастаткова даследуюцца асаблівасці адносін да патрыятызму, а таксама ступень

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ

яго актуалізацыі ў розных сацыяльных групах, асабліва сярод моладзі. У дадзеных умовах становіцца неабходным даследаваць змест, структуру і механізмы патрыятычнага выхавання моладзі ў кантэксце фарміравання сучаснай палітычнай культуры Рэспублікі Беларусь.

Развіццё грамадзянскасці і патрыятызму студэнцкай моладзі ў дачыненні да сацыяльнага праекта Беларусі выступае адным з найважнейшых фактараў забеспячэння стабільнага развіцця і бяспекі краіны ў глабальным супольніцтве. Сацыяльна-гуманітарныя дысцыпліны, якія выкладаюцца студэнтам у працэсе прафесійнай падрыхтоўкі, выконваюць асобную ролю ў развіцці патрыятычнай самасвядомасці. Вылучэнне ў іх змесце патрыятычных фактаў, ідэй, сацыякультурных каштоўнасцей садзейнічае больш паспяховаму засваенню маладымі людзьмі структурных кампанентаў патрыятызму з улікам будучай прафесійнай дзейнасці.


*1. Лоуэнталь, Д.* Прошлое – чужая страна / Д. Лоуэнталь. – СПб. : Владимир Даль, 2004. – 623 с.

*2.* Об основах государственной молодежной политики : Закон Республики Беларусь, 7 дек. 2009 г., №65-З // Нац. реестр правовых актов Респ. Беларусь. – 2009.

*3. Орлов, В. Б.* Патриотизм как ценность гражданского общества / В. Б. Орлов, В. И. Лесняк // Вестн. Югор. гос. ун-та. – 2006. – Вып. 3. – С. 80–86.

*4. Панарин, А. С.* Искушение глобализмом / А. С. Панарин. – М. : Эксмо-Пресс, 2002. – 416 с.


УДК 021:379.8

# ЛЮБИТЕЛЬСКИЕ ОБЪЕДИНЕНИЯ В БИБЛИОТЕКАХ БЕЛАРУСИ: ОСНОВНЫЕ НАПРАВЛЕНИЯ ДЕЯТЕЛЬНОСТИ

***Н. Ю. Берёзкина,*** *кандидат исторических наук, доцент, доцент Института повышения квалификации и переподготовки кадров учреждения образования «Белорусский государственный университет культуры и искусств»*

**Аннотация.** В статье рассмотрены любительские объединения и клубы по интересам, созданные в библиотеках Беларуси. Определен наиболее распространенный подход к классификации любительских объединений: по тематической направленности и целевой аудитории. По тематическому принципу любительские объединения подразделяются на клубы, деятельность которых посвящена эстетической проблематике (музыке, изобразительному искусству, театру, литературе, поэзии), самодеятельному творчеству, краеведению, экологии и др. При дифференциации любительских объединений по возрастному признаку выделены клубы и творческие объединения для детей разного возраста, молодежные любительские объединения, клубы для читателей пожило-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ